НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

# Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі

*Матэрыялы
Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
(Мінск, 24 верасня 2009 г.)*

Мінск
«Беларуская навука»
2010

УДК 94(476)“1939”(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
В76

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук прафесар А. А. Каваленя), заданне «05» – «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах XIX–XX стст.» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт М. У. Смяховіч)*

Рэдакцыйная калегія:

А. А. Каваленя (гал. рэд.), М. У. Смяховіч (нам. гал. рэд.), В. В. Даніловіч, М. Г. Жылінскі, У. Ф. Ладысеў, К. Д. Ганчарэнка (адказны сакратар)

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар Я. К. Новік;
доктар гістарычных навук, дацэнт У. І. Кузьменка

В76 **Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі :** матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 верас. 2009 г.) / рэдкал. : А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 414 с.
ISBN 978-985-08-1187-5.

У кнізе прадстаўлены матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі», якая адбылася ў Мінску 24 верасня 2009 г. У дакладах і паведамленнях беларускіх і замежных даследчыкаў на багатым фактычным матэрыяле з выкарыстаннем новых архіўных дакументаў і найноўшых дасягненняў гістарыяграфіі адлюстравана складаная і шматпланавая праблема гістарычнага лёсу Беларусі ў міжваенны і пасляваенны перыяд.

Адрасавана студэнтам і магістрантам, аспірантам і суіскальнікам, спецыялістам у вобласці сусветнай і айчыннай гісторыі, шырокаму колу чытачоў.

**УДК 94(476)“1939”(082)**
**ББК 63.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-1187-5**

© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2010

## *АРГКАМІТЭТ*

### Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «ВОСЕНЬ 1939 ГОДА Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЛЁСЕ БЕЛАРУСІ»

*Каваленя Аляксандр Аляксандравіч* – Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар (старшыня аргкамітэта);

*Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч* – намеснік дырэктара па навуковай працы Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (намеснік старшыні аргкамітэта);

*Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч* – загадчык цэнтра гісторыі індустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (кіраўнік сакратарыята);

*Анофранка Наталля Васільеўна* – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

*Ганчарэнка Кірыл Дзмітрыевіч* – лабарант І катэгорыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

*Жылінскі Марат Генадзевіч* – вучоны сакратар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*Забаўскі Мікалай Міхайлавіч* – дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар;

*Зенчанка Сяргей Валянцінавіч* – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

**А. М. Вабішчэвіч**

*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна*

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ АДНОСІНЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Палітыка польскіх улад у галіне культуры, асветы беларусаў і іншых нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Заходняй Беларусі ад Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. да падзей верасня 1939 г. ажыццяўлялася ў кантэксце дзяржаўнай палітыкі ў сферы нацыянальнага і канфесіянальнага жыцця. Яна не атрымала пэўнага завершанага і цэласнага характару, складвалася пад уплывам заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, палітыка-ідэалагічных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых фактараў. На наш погляд, можна вылучыць 4 асноўныя мадэлі вырашэння нацыянальна-культурных праблем, прапанаваныя рознымі польскімі палітычнымі сіламі: нацыянальна-дэмакратычную; кансерватыўную; ліберальна-дэмакратычную; камуністычную [1, с. 19–22].

Нацыянальна-дэмакратычная мадэль распрацоўвалася эндэкамі і іншымі правымі польскімі аб'яднаннямі ў кантэксце інкарпарацыйнай канцэпцыі дзяржаўнага ўладкавання Польшчы. Перавага надавалася нацыянальным польскім інтарэсам, польская культура прадстаўлялася ў якасці вышэйшай, цывілізаванай. Асіміляцыя найбольш падатлівых беларусаў павінна была адбывацца гвалтоўнымі метадамі пры ўдзеле польскай школы, культурна-асветніцкіх арганізацый і ўстаноў, арміі, адміністрацыйна-паліцэйскага апарату, пры стварэнні перспектывы цывілізацыйнага росту. Вырашэнне яўрэйскага пытання планавалася ажыццявіць шляхам ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця. Яўрэі прызнаваліся эндэкамі прыналежнымі да іншай (чужой) цывілізацыйнай плыні, таму іх нельга было асіміляваць, за выключэннем невялікай часткі.

Кансерватыўная мадэль прадугледжвала паступовыя, памяркоўныя метады нацыянальнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Ідэолагі віленскіх кансерватараў разглядалі дзяржаўную

асіміляцыю ў якасці першага істотнага кроку ў напрамку дэнацыяналізацыі ўкраінцаў, беларусаў.

Ліберальна-дэмакратычная мадэль, якой прытрымліваліся нешматлікія народніцкія, ліберальныя і сацыялістычныя партыі і аб'яднанні, частка мясцовай польскай інтэлігенцыі, дэманстравала прыхільнае стаўленне да ідэй тэрытарыяльнай аўтаноміі ўкраінцаў і беларусаў, адмаўляла антысемітызм і нацыянальную дыскрымінацыю. Значная частка яе тэарэтычных пастулатаў укладвалася ў кантэкст федэрацыйнай ці краёвай канцэпцый дзяржаўнага ўладкавання, нярэдка ўтрымлівала элементы тэорыі рэгіяналізацыі. Паводле Л. Васілеўскага, беларусы і ўкраінцы заслугоўвалі тэрытарыяльнай аўтаноміі, яўрэі – культурнай аўтаноміі [2]. Выступаючы супраць планаў фарсіраванай паланізацыі эндэкаў, Л. Васілеўскі падтрымліваў дзяржаўную асіміляцыю. Стварэннем лепшых умоў для развіцця культуры, асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў параўнанні з БССР можна было супрацьстаяць савецкаму ўплыву [3, s. 26; 4, s. 395]. Інтарэсы ўкраінцаў у Палескім ваяводстве прапаноўвалася разглядаць асобна ад заходнеўкраінскага насельніцтва, а палескі рэгіён падлягаў у перспектыве паланізацыі [5, s. 22–23]. Вырашэнне літоўскай праблемы бачылася Л. Васілеўскаму ў кантэксце нармалізацыі міждзяржаўных адносін і ўзаемнага забеспячэння правоў літоўцаў у Польшчы і палякаў у Літве [5, s. 13]. Л. Васілеўскі адмаўляў існаванне ў Польшчы рускай меншасці, называючы рускіх і іх культуру «перажыткам русіфікатарскай эпохі» [6, арк. 7]. У стыхійнай моўнай асіміляцыі яўрэйскай інтэлігенцыі бачылася аслабленне адметнасці яўрэйскага насельніцтва ад польскага [7, арк. 369]. У рамках дзяржаўнай асіміляцыі прапаноўвалася задавальняць нацыянальныя інтарэсы яўрэяў у галіне адукацыі, зняць абмежаванні і аблегчыць іх эміграцыю [8, арк. 33]. У цэлым пры пэўных уступках для няпольскага насельніцтва ліберальна-дэмакратычная мадэль надавала перавагу забеспячэнню інтарэсаў польскай дзяржаўнасці, не давала магчымасці для паўнацэннага нацыянальна-культурнага жыцця няпольскага насельніцтва.

Камуністычная мадэль надавала перавагу класавым (сацыяльным) інтарэсам у параўнанні з нацыянальнымі, падвяргала асу-

джэнню нацыянальную палітыку польскіх улад, адстойвала правы няпольскага насельніцтва. Адзіным сродкам вырашэння нацыянальнага пытання прызнавалася пралетарская рэвалюцыя. Польскія камуністы выступалі за права Заходняй Беларусі на самавызначэнне і ўз'яднанне яе з БССР, што было зафіксавана на II з'ездзе Камуністычнай рабочай партыі Польшчы ў верасні 1923 г.

У рэальнай палітыцы дамінуючыя пазіцыі як на ўрадавым узроўні, так і асабліва сярод адміністрацыйнага апарату на тэрыторыі Заходняй Беларусі набыла нацыянальна-дэмакратычная мадэль. Прадэклараваныя рэжымам «санацыі» змены ў нацыянальнай палітыцы (замест нацыянальнай асіміляцыі – дзяржаўная асіміляцыя) сведчылі аб адыходзе ад папярэдняй нацыянальна-дэмакратычнай мадэлі ў бок ліберальна-дэмакратычнай. Аднак пасля непрацяглага (у 1926–1929 гг.) і эпізадычнага выкарыстання больш памяркоўных і завуаліраваных элементаў ліберальна-дэмакратычнай мадэлі з канца 1920-х гадоў фактычна адбылося вяртанне да папярэдняй нацыянальна-дэмакратычнай мадэлі. Пры выкарыстанні элементаў канцэпцыі рэгіяналізму (асабліва на Палессі) былі ўлічаны мясцовыя асаблівасці, аднак польская адміністрацыя свае дзеянні ажыццяўляла ў рамках афіцыйнай урадавай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі.

У другой палове 1930-х гадоў польскія ўлады ажыццявілі цэлы комплекс гвалтоўных мер: правялі канчатковую ліквідацыю нешматлікіх беларускіх школ, арганізацый, газет, разгарнулі дэрусіфікацыю і паланізацыю праваслаўнай царквы, узмацнілі кантроль за грамадскім жыццём. Адначасова з рэпрэсіўнымі дзеяннямі актывізавалася дзейнасць мясцовай адміністрацыі, ваенных колаў у напрамку ўзмацнення нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Гэта часткова ці нават поўнасцю адпавядала ідэалагічным пастулатам (нават самым радыкальным) нацыянальна-дэмакратычнай канцэпцыі вырашэння нацыянальных пытанняў. Такая актыўнасць тлумачылася недастатковай выніковасцю папярэдніх мер у напрамку паланізацыі і асіміляцыі няпольскага насельніцтва (найперш беларусаў) і намерамі істотна паскорыць гэтыя этнічныя працэсы ў бліжэйшай перспектыве. На выпрацоўку планаў паланізацыі Палесся ўплывалі не толькі асаблівасці этнакан-

фесійнага складу насельніцтва, але і востры характар аграрнага пытання, слабая ступень урбанізацыі, высокі ўзровень непісьменнасці, няразвітасць сацыяльнай інфраструктуры.

Пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту праблема нацыянальных меншасцей стала манапольнай у дзейнасці адміністрацыйнага апарату, а не парламенцкіх структур. Насуперак папярэднім абяцанням аб выпрацоўцы асобных падыходаў да кожнай этнічнай супольнасці прэм'ер-міністр К. Бартуль 19 ліпеня 1926 г. адзначаў у польскім сейме, што не збіраецца заключаць асобныя пагадненні з нацыянальнымі меншасцямі ці мяняць заканадаўства [9, с. 129]. Менавіта на адміністрацыйны апарат ўскладвалася задача аб дзяржаўнай асіміляцыі.

Палітыка польскіх улад насіла асіміляцыйны характар не толькі ў дачыненні да беларусаў, але і адносна рускіх, украінцаў. На ўзроўні рэгіянальных уладных структур істотна абмяжоўвалася культура, асвета ўкраінцаў на тэрыторыі Палескага ваяводства. Вырашэнне літоўскай праблемы ставілася ў прамую залежнасць ад урэгулявання міждзяржаўных польска-літоўскіх адносін. Польскія ўлады не выпрацавалі асобных мер ці элементаў тэорыі рэгіяналізацыі адносна яўрэяў на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Польскай дзяржавы.

Аналіз нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускага краю ў 1921–1939 гг. дае магчымасць вылучыць два асноўныя тыпы этнакультурных адносін, якія адрозніваліся паміж сабой характарам, дынамікай узаемаадносін, уздзеяннем этнапалітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых фактараў [1, с. 261–264]. Першы тып этнакультурных адносін (беларусы–палякі) вызначаўся канфрантацыйным, вострым характарам і выключаў магчымасці пазітыўнага культурнага ўзаемадзеяння. Канфлікт быў прадвызначаны палітычнымі, эканамічнымі, канфесіянальнымі, дэмаграфічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі фактарамі, ключавымі пазіцыямі палякаў у грамадскім жыцці. Агульнанацыянальны патрыятычны ўздым палякаў, які назіраўся адразу пасля аднаўлення іх дзяржаўнасці, змяніўся міфалагізаванымі месіянскімі канцэпцыямі, што знайшлі ўвасабленне ва ўрадавай палітыцы, дзеяннях мясцовага адміністрацыйнага апарату і грамад-

скай свядомасці, для якой стала характэрнай большая эгаістычнасць і неталерантнасць у адносінах да беларусаў, а таксама адносна іншых этнасаў. Дзяржаўная падтрымка павінна была забяспечыць польскай культуры пануючыя пазіцыі ў Заходняй Беларусі. Ва ўмовах пастаянных абмежаванняў, прыгнечання і гвалту супраць культуры, адукацыі, мовы, традыцый беларусаў замест узаемадзеяння, дыялога культур назіралася іх жорсткае супрацьстаянне. Зыходнай пазіцыяй для такога характару адносін з'яўлялася нераўнапраўнае становішча беларускай культуры ў межах Польскай дзяржавы. Дамінуючай была тэндэнцыя культурна-моўнай асіміляцыі беларускага насельніцтва, якая ажыццяўлялася дзяржаўным апаратам, рымска-каталіцкім касцёлам і іншымі грамадскімі інстытутамі. З'яўляюцца беспадстаўныя спробы рэабілітацыі на сучасным этапе грамадска-культурнай дзейнасці польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая быццам спрыяла працэсам беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. Паланафільскія настроі не атрымалі падтрымкі заходнебеларускага грамадства і не маглі паўплываць на агульны характар беларуска-польскіх культурных адносін. Пасля ліквідацыі інстытуцыянальных форм нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у канцы 1930-х гадоў іх асіміляцыя павінна была паскорыцца. Нягледзячы на пагражальны характар, асіміляцыя беларусаў не паспела набыць завершанага характару, не прывяла да незваротных этнатрансфармацыйных вынікаў, зводзілася пераважна да татальнай паланізацыі большасці сфер грамадскага жыцця. Былі задзейнічаны ўсе мабілізацыйныя механізмы этнакультурнага самазахавання беларусаў ва ўмовах рэальнай страты іх самастойнага існавання.

Другі тып этнакультурных адносін ахопліваў палякаў і нацыянальныя этнаканфесійныя меншасці (яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы, татары), меў неаднародны характар, балансіраваў паміж канфрантацыяй і часовым суіснаваннем. У адносінах да славянскіх меншасцей (рускіх, украінцаў), літоўцаў ажыццяўлялася палітыка нацыянальнай асіміляцыі. Пад прыкрыццем дэрусіфікацыі адбывалася насаджэнне рускім польскай мовы, культуры, традыцый. Толькі рускія стараабраднікі атрымалі абмежаваныя магчы-

масці для захавання рэлігійных каштоўнасцей, традыцый, мовы. Адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця старaабраднікаў стрымліваў яго асіміляцыю. Гэтую акалічнасць адзначалі ўлады Беластоцкага ваяводства, дзе прысутнасць стараабраднікаў была нязначнай. «Як маса, стараабраднікі з'яўляюцца замкнутым асяроддзем, якое не паддаецца асіміляцыйным уплывам і не страціла свайго маскоўскага фальклору, у палітычных адносінах не выклікае пярэчанняў». «Не праяўляюць тэндэнцыі да польскай культурнай асіміляцыі. Знаходзячыся ў памежнай паласе, з'яўляюцца хутчэй непажаданым элементам, хоць прызнаюцца лаяльнымі» [10, арк. 26 адв.; 11, арк. 30].

Украінскае насельніцтва заходнепалескага рэгіёна было пазбаўлена магчымасці (асабліва з пачатку 1930-х гадоў) мець уласныя культурна-асветніцкія і адукацыйныя ўстановы. Улічваючы адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця яўрэйскай супольнасці, які выключаў перспектывы паскоранай асіміляцыі, адносна яе актыўна выкарыстоўваліся самыя разнастайныя абмежавальныя меры, аказвалася спрыянне эміграцыі яўрэяў, падтрымлівалася антысеміцкая кампанія. Вясной 1939 г. Беластоцкая ваяводская адміністрацыя прызнавала слабую выніковасць асіміляцыі мясцовых яўрэяў. «Нягледзячы на працяглыя ўплывы, «літвакі» не змаглі прывязацца да польскай дзяржаўнасці і культуры. Да цяперашняга часу карыстаюцца рускай мовай, складаюць пераважна дэструктыўны, у лепшым выпадку абыякавы да Польскай дзяржавы, элемент» [11, арк. 6].

Праблема тэрытарыяльнай прыналежнасці Вільні прадвызначыла напружаны характар польска-літоўскіх адносін. Літоўскае насельніцтва ў заходнебеларускіх мясцовасцях падвяргалася нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Для польскіх улад уяўляліся нязначнымі праблемы татарскай этнічнай групы. Хоць татары мелі магчымасці для захавання рэлігійных, культурных і грамадскіх традыцый, аднак адбывалася паланізацыя іх інтэлігенцыі і іншых сацыяльных слаёў. У цэлым для нацыянальных і этнаканфесійных меншасцей на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі істотна абмежаваны ці нават выключаны магчымасці для прагрэсіўнага, паступальнага нацыянальна-культурнага развіцця ў бліжэйшай перспектыве.

## Крыніцы і літаратура


1. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст, 2008. – 319 с.

2. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (dalej – AAN). – Zespół 390. – Sygn. 74: Польская палітыка адносна нацыянальных меншасцей. Палітыка адносна ўкраінцаў. Дакладныя запіскі, артыкулы, вытрымкі прэсы, карэспандэнцыя (1909, 1916–1930 гг.).

3. Wasilewski, L. Zadania polskiej polityki narodowościowej / L. Wasilewski // Droga. – 1923. – № 4. – S. 25–28.

4. Wasilewski, L. Białoruś i ruch białoruski / L. Wasilewski // Przegląd Współczesny. – 1924. – № 9. – S. 386–396.

5. Wasilewski, L. Sprawa kresów i mniejszości narodowych w Polsce / L. Wasilewski. – W-wa, 1925. – 105 s.

6. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 76: Нацыянальныя адносіны ў Польшчы. Руская меншасць. Артыкулы, нататкі, вытрымкі прэсы (1925 г.).

7. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 73: Нацыянальныя адносіны ў Польшчы. Артыкулы, нататкі, газетныя выразкі (1910–1935 гг.).

8. AAN. – Zespół 390. – Sygn. 74: Польская палітыка адносна нацыянальных меншасцей. Палітыка адносна ўкраінцаў. Дакладныя запіскі, артыкулы, вытрымкі прэсы, карэспандэнцыя (1909, 1916–1930 гг.).

9. Paruch, W. Od konsolidacji państwowej do konsolidacji narodowej: Mniejszości narodowe w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) / W. Paruch. – Lublin, 1997. – 424 s.

10. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2305: Справаздачы палескага і беластоцкага ваявод аб агульным рэлігійным настроі на тэрыторыі адзначаных ваяводстваў... (1933–1939 гг.).

11. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1574: Рэферат беластоцкага ваяводы аб праблемах умацавання становішча і ўзмацнення ўплыву польскага насельніцтва ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ваяводства (30.01.1939 г.).